# СКАЗ

**Успомніце**

Якія бываюць сказы па мэце выказвання і інтанацыі?

Выкарыстайце схему.

**Тыпы сказаў**

| **па мэце выказвання** | **па інтанацыі** |
|---|---|
| 1. Вучні дружна працуюць. | Вучні дружна працуюць! |
| 2. Хто адкажа на пытанне? | Хто адкажа на пытанне?! |
| 3. Давайце дружна працаваць на ўроку. | Давайце дружна працаваць на ўроку! |

**59.** Прачытайце. Вызначце тыпы сказаў па мэце выказвання і інтанацыі.

Ці збіралі вы падасінавікі Падасінавікі растуць пад асінамі Які прыгожы падасінавік вырас на паляне Давайце сходзім заўтра ў грыбы

Сяргейка любіць маляваць Як прыгожа малюе Сяргейка Давайце намалюем кошык з грыбамі Дзе знаходзіцца выстава дзіцячых малюнкаў

Спішыце. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку.

Падкрэсліце пытальныя словы ў пытальных сказах.

**Успомніце**

Як вызначаецца сувязь слоў у сказе? Выкарыстайце схему.

*Працавітая Ірынка прыбірае ў кватэры.*

**60.** Прачытайце скорагаворку.

**На** рацэ каля хаціны ўзвялі бабры плаціну. *(М. Пазнякоў.)*

Растлумачце правапіс выдзеленых літар і слоў. Запішыце скорагаворку па памяці.

Падкрэсліце ў сказе дзейнік і выказнік.

**61.** З асобных слоў складзіце па схеме прыказку. Чаму так гавораць?




пчолка, на, ляціць, лю́буючы, кветку

**лю́бая** — мілая, любімая

**62.** Прачытайце і адгадайце загадку.



В..сёлыя хлопцы ж..вуць у каробцы. *(Р. Яўсееў.)*

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.
Вусна вызначце сувязь слоў у сказе. Пабудуйце яго схему.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**63.** Прачытайце верш. Чаму здзівіўся баравік?



**Баравік**

Па р*(а/о)*се без чаравік
выбе*(г/х)* з бору б*(а/о)*равік.
Бачыць сонца...
Дзіўна трошкі:
як яно расце без но*(ж/ш)*кі?!

*Д. Бічэль.*

Спішыце, раскрываючы дужкі.

Вусна вызначце сувязь слоў у першым сказе. Падкрэсліце ў ім дзейнік і выказнік.

❖ Абазначце корань у аднакаранёвых словах.

## Аднародныя члены сказа

**64.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце сказы.




што?
Мікіта купіў **альбом.**

што?
Мікіта купіў **алоўкі.**

што?
Мікіта купіў **фарбы.**

Вусна вызначце сувязь слоў у сказах. Чым яны падобны? Якімі членамі сказа адрозніваюцца?




Замяніце тры сказы адным. Запішыце гэты сказ. Падкрэсліце ў запісаным сказе галоўныя члены. Пастаўце пытанні да дадзеных членаў сказа. Ад якога слова вы ставілі пытанні?

**Члены сказа, якія адносяцца да аднаго слова ў сказе і адказваюць на адно і тое ж пытанне, называюцца аднароднымі.**

**65.** Прачытайце пары сказаў. Вусна вызначце сувязь слоў у гэтых сказах.

1. Дзеці вучацца. Дзеці пішуць, чытаюць, малююць.
2. Каляровыя фішкі ляжаць на партах. Чырвоныя, жоўтыя, зялёныя фішкі ляжаць на партах.
3. У пенале ляжаць школьныя прылады. У пенале ляжаць ручкі, алоўкі, фламастары.

Прачытайце сказы, якія адпавядаюць наступным схемам:




Якія аднародныя члены ёсць у кожным сказе?
Запішыце сказы з аднароднымі членамі.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**Аднароднымі могуць быць дзейнікі, выказнікі, даданыя члены сказа.**

**66.** Прачытайце скорагаворку. Выдзеліце голасам назвы грыбоў. Зрабіце невялікую паўзу ў пазначаных месцах.

**Ры́жыкі**|, **баравікі́**|, **лісі́чкі** прынеслі ў кошыках сястрычкі.

Вусна вызначце сувязь слоў у сказе. Якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы? Назавіце слова, да якога адносяцца аднародныя члены сказа.

Аднародныя члены сказа вымаўляюцца з **інтанацыяй пералічэння:** на кожны з іх ставіцца націск, паміж імі робіцца паўза.

**67.** Вусна дапоўніце кожную размову патрэбнымі сказамі з аднароднымі членамі. Вымавіце гэтыя сказы з адпаведнай інтанацыяй.

Б а б у л я. Чым ты займаешся ў музычнай школе, Ірачка?

У н у ч к а. Я ... .





Д а ч к а. З якіх прадуктаў мы будзем гатаваць дранікі?

М а м а. Мы возьмем … .







Т а т а. Паўлік, якія ўрокі ты падрыхтаваў на заўтра?

С ы н. Я падрыхтаваў … .

**Рм** Разыграйце ў парах адну размову на выбар.

**68.** Прачытайце верш. Пра што людзі часта ма́раць восень? Чаму? Назавіце ў вершы словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

**Восеньскія сны**

Санкі, лыжы і канькі
лічаць вос..ні дз..нькі.
Сніцца ім сн..жок іскрысты,
сніцца ім л..док празрысты.
А ў дз..цей якія сны?
Тое ж бачаць і яны.

*Н. Галіноўская.*

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

Падкрэсліце дзейнік і выказнік у першым сказе. Назавіце ў ім аднародныя члены. Да якога слова ў сказе яны адносяцца?

**69.** Спішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

1. На перапынках у школе дзеці гуляюць, адпачываюць. 2. Таня, Света, Ігар разам ходзяць у школу.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

3. Настаўніца раздала вучням фарбы, пэндзлікі. 4. На канікулах дзеці наведаюць тэатр, музей, выставу. 5. Уладзік прачнуўся, пацягнуўся, усміхнуўся матулі. 6. Бабуля частавала ўнукаў пірагамі, блінамі, мёдам. 7. Тата, мама, дзеці садзяць каля дома дрэвы.

**70.** Прачытайце сказы. Вызначце сувязь слоў у іх, назавіце аднародныя члены.

Бліснула яркая, асляпляльная маланка. Птушкі, звяры, матылькі пахаваліся ад дажджу. Па дрэвах, па траве забарабанілі дажджавыя кроплі. Праз хвіліну загрымеў, загрукатаў гром.

**грымéць**

Спішыце сказы ў той паслядоўнасці, у якой змешчаны схемы да іх.




Што атрымалася ў выніку спісвання? Дайце назву тэксту.

У кожным сказе падкрэсліце словы, да якога адносяцца аднародныя члены.

**71.** Прачытайце. На каго падобна навальніца ў вершы? Назавіце словы, якія падказалі вам гэта.

### Навальніца

Цёмнае страш*(ы/і)*дла
вокны **патуш*(ы/і)*ла,**
**зачыніла** вароты,
**ра*(з/с)*дражніла** грымоты.

Па нябёсах угалоп
вараны́я коні.
Дождж буйны, як спелы боб,
сыпануў на гоні.

*Д. Бічэль.*



**на го́ні** — на палі, на ніве

Дакажыце, што выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі членамі сказа. Якую ролю ў сказе яны выконваюць?

Спішыце першы сказ. Падкрэсліце ў ім галоўныя члены.

Знайдзіце слова, аднакаранёвае да слова *грымець*. Разбярыце яго па саставе.

**72.** З прапанаваных частак складзіце прыказкі.

Работа не бя*(з/с)*чэсціць,

У добрай гаспадыні

ёсць сала і масла *(у/ў)*скрыні.

а кр*(е/э)*піць і цешы*(т/ц)*ь.

Запішыце прыказкі, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце ў сказах дзейнік і выказнік, назавіце аднародныя члены.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**73.** Складзіце па схемах сказы з аднароднымі членамі. Выкарыстайце малюнкі.





*д. ч.*, *д. ч.* ________ ________ *д. ч.*.

*д. ч.* ________ ________, ________, ________.

## *Творчая хвілінка*

На гербе якога беларускага горада адлюстраваны лебедзь? Чаму? Апішыце словамі гэты герб. Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**74.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў. Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме.

Прырода рыхтуецца да зімы жоўтае, чырвонае, бурае лісце ападае з дрэў стрыжы, салаўі, ластаўкі, гусі, качкі адлятаюць у вырай ляшчы, карпы, ліні хаваюцца ў глыб вадаёмаў мядзведзі, вожыкі, барсукі, змеі ўпадаюць у спячку.

Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Падкрэсліце ў іх галоўныя члены сказа.

**75.** Прачытайце сказы з адпаведнай інтанацыяй. Назавіце ў іх аднародныя члены.

1. Людзі гулялі па плошчы, па парку. Людзі гулялі па плошчы **і** па парку.
2. Федзя не пакінуў сябра ў бядзе, дапамог яму. Федзя не пакінуў сябра ў бядзе, **а** дапамог яму.
3. Таня глядзела на дрэва, не заўважала гняздзечка. Таня глядзела на дрэва, **але** не заўважала гняздзечка.

Назавіце словы, якімі адрозніваюцца сказы кожнай пары. **?!** Што злучаюць гэтыя словы ў сказах? Запішыце сказы са словамі ***і, а, але***.

Аднародныя члены сказа звязваюцца паміж сабой інтанацыяй пералічэння і словамі ***і, а, але***. Словы ***і, а, але*** — гэта **злучнікі**.

**76.** Прачытайце тэкст. Як Валя дапамагла хлопчыку знайсці рукавічку?

## Рукавічка

Валя выканала дамашнія заданні, выйшла на вуліцу. Каля яе дома ёсць невялікі, але ўтульны двор. Вакол растуць таполі і клёны.

Дзяўчынка паглядзела ва ўсе бакі, але сябровак не ўбачыла. Валя пастаяла, падумала, пайшла па пратапта́най дарожцы.

Раптам яна ўбачыла на дарожцы рукавічку. Дзяўчынка агледзелася. Навокал нікога не было відаць. Валя павесіла знаходку на кусце і вярнулася дамоў.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

У кватэры яна распранулася, падышла да акна. Дзяўчынка глянула на кусцік і знайшла вачамі рукавічку. Праз некалькі хвілін Валя заўважыла жанчыну з маленькім хлопчыкам. Хлопчык не прайшоў міма, а зняў рукавічку з кусціка. Потым ён дастаў з кішэні такую ж рукавічку. Мама і сын былі задаволены. Валя парадавалася, што згубленая рэч знайшла свайго гаспадара. *(Паводле П. Рунца.)*



Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Выпішыце тры сказы, у якіх аднародныя члены звязаны злучнікамі ***і, а, але***. Падкрэсліце ў гэтых сказах галоўныя члены.

**Рм** Вызначце тып тэксту. Падзяліце яго на часткі. Вусна перакажыце тую частку, да якой прапанаваны малюнак.

**77.** Дапоўніце сказы аднароднымі членамі. Карыстайцеся словамі для даведкі.

1. ..., ..., ... беглі да рэчкі. 2. ... і ... ліў дождж. 3. Вавёрка ... на суседняе дрэва, а хутка зусім ... з вачэй. 4. ..., але ... надвор'е трымалася цэлы тыдзень.

Словы для даведкі: *пераскочыла, знікла; удзень, уночы; Паўлік, Ягорка, Ганначка; цёплае, пахмурнае.*

Выпішыце сказы з аднароднымі даданымі членамі. Падкрэсліце злучнікі, якія звязваюць аднародныя члены сказа.

**78.** Прачытайце скорагаворку Міхася Пазнякова па стрэлках. Навучыцеся выразна і правільна яе вымаўляць.




Знайдзіце ў сказе галоўныя члены. Назавіце ў ім аднародныя члены сказа.

Як звязаны паміж сабой у сказе аднародныя дзейнікі? Як звязаны паміж сабой аднародныя даданыя члены сказа?

**79.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх злучнікамі ***і, а, але***.

1. Пасля ўдалага палявання ліса ціха … нерухома ляжала ў нары. 2. Месяц свеціць, … не грэе. 3. Мама прыгатавала абед, … потым павяла дачушку ў заапарк. 4. Ваня … тата прыбіралі ў кватэры. 5. Зайка ласаваўся морквай … капустай. 6. Бацькí … дзеці зграбалі сухое лісце.

Выпішыце спачатку сказы з аднароднымі дзейнікамі, потым — з аднароднымі выказнікамі, нарэшце — з аднароднымі даданымі членамі сказа.

У кожным сказе падкрэсліце словы, да якога адносяцца аднародныя члены.



Правообладатель Акадэмія адукацыі